# ДЭКАРАТЫЎНА-ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ТВОРАЎ БІСЕРНАГА МАСТАЦТВА

*Сахарчук Алеся Міхайлаўна,*
*Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў, аспірантка*

*Анатацыя. Прапанаваны інавацыйны падыход да тэорыі мастацтва бісеру, якое разглядаецца як спецыфічны від дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Спецыфіку абумоўлівае магчымасць яго суаднясення з выяўленчымі відамі мастацтва. Асаблівая ўвага акцэнтуецца на тэарэтыка-метадалагічным аспекце: прапаноўваюцца аўтарскае вызначэнне паняцця «бісер» і яго класіфікацыя як матэрыяла. Аналізуюцца дэкаратыўна-выяўленчыя асаблівасці твораў бісернага мастацтва, вызначаюцца дэкаратыўныя якасціўласна бісеру.*

З глыбіні гісторыі прыйшло да нас бісернае рукадзелле. Змяняліся матэрыялы і спосабы стварэння рэчаў, з'яўляліся новыя арнаменты, кампазіцыі. Нязменным засталося толькі імкненне да прыгажосці. Бісер — унікальны і вельмі цікавы мастацкі матэрыял. Але матэрыял лі гэта толькі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва?

Існуе дастатковае мноства літаратурных крыніц і навуковых даследаванняў бісернага мастацтва. Дадзенай праблематыкай займаліся наступныя навукоўцы: Г. Пазаурэк — гісторык мастацкага шкларобства, які першы вызначыў бісер, як асобны аб'ект навуковага даследавання ў межах прыкладнога мастацтва і ў неразрыўнай сувязі з мастацкім шкларобствам [8,9,10]; Э. Хольм — першая сярод навукоўцаў, хто падкрэсліла каштоўнасць бісеру, як асобнага матэрыялу [7]; В. А. Дударава — даследчыца, якая першая адзначыла, што рускі бісер — унікальная і самастойная з'ява расійскай мастацкай культуры [2].

Храналагічныя рамкі з'яўлення бісернага мастацтва — вельмі спорнае ў сучасным мастацтвазнаўстве пытанне. Як сцвярджае ў сваім дысертацыйным даследаванні «Русский бисер в отечественной культуре второй половины XVII—XIX в.» мастацтвазнаўца і даследчыца рускага бісернага мастацтва В. В. Малчанава, толькі ў пачатку ХХ стагоддзя з'явіліся першыя даследаванні, у якіх бісернае рукадзелле выдзяляецца ў самастойную галіну прыкладнога мастацтва. Аднак як з'ява, бісер «нарадзіўся» разам з выкрыццем шкла. Гісторыя бісеру неад'емна звязана з гісторыей шкларобства. Першымі поўнасцю шклянымі вырабамі ва ўсіх народаў былі пацеркі. Існуе меркаванне, што вынаходніцтва шкла адбылося не ў канкрэтны гістарычны момант, а ўзнікала ў розныя часы ў розных народаў калі вытворчыя сілы дасягалі пэўнага ўзроўню развіцця, і там, дзе для гэтага складаліся спрыяльныя прыродныя ўмовы — менавіта такой думкі прытрымліваецца айчынная мастацтвазнаўца М. М. Яніцкая [6, с. 3], якая разглядае бісер у пэўнай сукупнасці з мастацкім шклом.

Комплекснае аналітычнае асэнсаванне дакументальных і іканаграфічных крыніц па дадзенай праблематыцы дазваляе сёння канстатаваць наступныя накірункі асэнсавання бісернага мастацтва: 1) бісернае мастацтва як асобная галіна дэкаратыўнапрыкладного

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацтва (далей ДПМ); 2) бісернае мастацтва як састаўная частка шкларобства. Пры гэтым застаецца неакрэсленым пытанне ўзаемадзеяння бісернага і выяўленчага мастацтваў, якія ў кантэксце вызначэння сродкаў выразнасці маюць відавочнае падабенства. На наступны момант бісернае мастацтва, якое разглядалася ў асноўным як частка ДПМ — састаўная частка дэкаратыўнага шкларобства, павінна быць разгледжана і асэнсавана не толькі з пункту гледжання яго толькі як прыкладнога, але і ўласна выяўленчага характару.

Адметнымі рысамі мастацкага твора, у тым ліку бісернага выраба з'яўляюцца: а) арыгінальнасць аўтарскай задумы; б) мастацкі густ; в) майстэрства выканання. Усе гэтыя рысы, гарманічна аб'яднаныя ў мастацкім творы, дазваляюць вытворцу максімальна разгарнуць уласцівасці таго ці іншага матэрыялу, яго каляровае багацце, форму, фактуру ўсяго вырабу ўвогуле. Работа з бісерам патрабуе ад майстра не толькі глыбокіх ведаў тэхнік выканання, уласцівасцей матэрыялу і колеразнаўства, але і ведаў аб уплыве формы і матэрыялу, з якога зроблена рэч, на колераўспрыманне яе чалавекам.

На працягу часу мастацтвазнаўцамі рабіліся спробы вызначыць сутнасць паняццяў «бісер» і «бісернае мастацтва». Абагульняючы існуючыя вызначэнні, мы сення адзначаем, што ***бісер — гэта шкляныя маленькія пацеркі (памерам ад 0,2 да 3 мм) разнастайнай формы (сферычнай, цыліндрычнай, біканічнай, канічнай, граненай, фантазійнай) з адтулінай для вышыўкі і нізання. Бісер вырабляўся з разнастайных матэрыялаў: рэчываў арганічнага паходжання, керамічных мае, дрэва, пластмасы, метапу. Метапічны бісер сустракаецца сення толькі як археалагічны матэрыял. Аднак на сучасным этапе бісер як матэрыял — гэта вынік эвалюцыі Разнастайных сілікатных тэхналогій і асноўным матэрыялам для стварэння бісеру ў сучаснай прамысловасці з'яўляецца шкло. Бісер сёння выкарыстоўваецца не толькі як матэрыял для стварэння утылітарных рэчаў і рэчаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, але і як элемент дызайну і фларыстыкі. Рэчы, зробленыя з бісеру, якія адлюстроўваюць уласнае ўспрыманне навакольнага свету мастаком з'яўляюцца творамі бісернага мастацтва***.

Асноўнымі ***мастацка-выразнымі сродкамі*** рэчы, зробленай з бісеру, на наш погляд, з'яўляюцца: 1) колер і яго суадносіны са светам і другімі колерамі (бляск, блікі)2) форма; 3) фактура; 4) памер.

Вызначэнныя мастацка-выразныя сродкі абумоўліваюць такія ***выяўленчыя*** / ***дэкаратыўныя якасці*** ўласна бісеру і кожнай пацеркі ў асобнасці, як:

1. колер і яго суадносіны са светам і другімі колерамі (бляск, блікі) і каляровае аздабленне: *пафарбаваны* — бісер, на які наносіцца знешняе каляровае пакрыцце; *вясёлкавы* — празрыстыя або непразрыстыя пацеркі, якія пераліваюцца ўсімі колерамі вясёлкі; *лінейны* — празрыстыя пацеркі, у якіх адтуліна для нанізвання мае каляровую афарбоўку; *жамчужны*

— бісер разнастайнай формы і адценняў, які знешне нагадвае жэмчуг; *паласаты* — арнамент гэтых пацерак складаецца з рознакаляровых ліній; *металізаваны* — паверхня і пакрыццё дадзенага віда бісера вельмі нагадвае метал.

2. форма пацеркі (*сферьнная, цылiндрычная, фантазійная і г. д.);*

3. фактура (імітацыя розных матэрыялаў і рэчываў, дасягнутая шляхам нанясення адпаведнага малюнку ці з дапамогай апрацоўкі шклянай паверхні);

4. памер — адрозніваецца па нумарам. Звычайна, лічбы азначаюць колькасць пацерак, якія могуць памясціцца ланцужком даўжыней 1 дзюйм (1 дзюйм = 2,54 см). Такім чынам маркіроўка пацерак 8/0 азначае, што на даўжыне 1 дзюйм размяшчаецца 8 пацерак. Чым больш буйны памер, тым менш яго нумар. Аднак, неабходна заўважыць, што памеры і вага пацерак у розных вытворцаў значна адрозніваецца, так што тэты прыцып можна браць, як кіруючы, але не абсалютны;

5. празрыстасць: *празрысты* бісер — празрыстыя пацеркі разнастайных колераў; *непразрысты* — гэта бісер з матавай або глянцавай паверхняй разнастайных колераў.

Бясконца колькасць варыяцый спалучэння пацерак. Бісер «нараджаецца» ў агні. Менавіта ён робіць шкляныя пацеркі цвёрдымі, яркімі і бляскучымі. Вырабы з бісеру і шклярусу ажываюць толькі пры свеце. Бляск — адна з галоўных характарыстык гэтага ўнікальнага матэрыялу. Бляск — гэта сіла інтэнсіўнасці свету, адбітага з паверхні пацеркі: частка светлавых прамянеў, праходзіць скрозь шкло, іншая — адлюстроўваецца ад яго паверхні. Такім чынам, бляск залежыць, з аднога боку ад уласцівасцей самога шкла, з іншага — ад якасці паліроўкі яго паверхні. Бляск дорыць бісерным рэчам «таямнічае жыццё». Дастаткова зайсці ў царкву, каб пераканацца ў гэтым. Невыпадкова ўсе часцей і часцей майстры бісерапляцення ствараюць іконы, вышытыя пацеркамі.

Аднак, адным з важнейшых кампазіцыйных і мастацка-выразных сродкаў у дэкаратыўна-прыкладным мастацтве з'яўляецца колер. Веданне ўласцівасцей колеру вельмі патрэбна пры рабоце з бісерам. Нягледзячы на яўную прастату кожнай асобнай пацеркі, сабраныя разам, яны не захоўваюць лакальны колер. Гэта адбываецца з прычыны таго, што кожны колер змяняецца лад уздзеяннем разнастайных фактараў. Асноўнымі прычынамі змянення з'яўляюцца:

1. узмацненне або, наадварот, паслабленне сілы свету;
2. выбар крыніцы асвятлення (сонца або штучны — лямпавы свет);
3. узаемадзеянне колераў пры сумяшчэнні і накладанні адзін на аднаго;
4. знаходжанне назіральніка адносна непасрэдна самога прадмету: вугал позірку і адлегласць на якой знаходзіцца назіральнік.

Акрамя гэтага, неабходна ўлічваць, як будзе ўплываць фон на ўспрыманне рэчы гледачом.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Цяжкасць работы з бісерам заключаецца ў тым, што майстар адразу павінен уявіць сабе ўсе магчымыя нюансы ўслрымання будучай гатовай бісернай рэчы. Асабліва гэта тычыцца колеру — ён не з'яўляецца лакальным, калі побач знаходзіцца другі колер і заўсёды непасрэдна звязаны з асяроддзем, у залежнасці ад гэтага можа быць як больш цёмным, так і больш светлым. Майстар імкнецца ўбачыць адразу усе тоны, каб вызначыць іх узаемаадносіны. З аднога боку, асаблівая ўвага надаецца розніце паміж пацеркамі падобных па ступені светласці (валерам). У большай ступені гэта тычыцца вышытых бісерных рэчаў.

З іншага боку, мастака цікавяць выяўленчыя узаемаадносіны фарбаў паміж сабой па ступені іх цеплыні або халаднасці. На гэтых суадносінах будуюцца асноўныя пошукі агульнай танальнасці бісернай рэчы. Калі перад майстрам стаіць задача прывабіць увагу да асобнага элементу агульнага малюнку, то пабудова арнаменту і малюнку адбываецца на кантрастнасці (спалучэнні розных па сваей насычанасці, святлаце фарбаў) розных відаў бісеру. Калі ў жывапісу кампазіцыя карціны будуецца на спалучэнні кантрастных колераў, то ў выніку не заўседы атрымоўваецца гарманічны малюнак. Але ў бісерным мастацтве нават самыя яркія лакальныя каляровыя плямы можна паспяхова звязаць паміж сабой. Напрыклад, тэхналогія выканання рэчаў з пацерак і бісеру дазваляе выкарыстоўваць эфект аптычнага прасторавага змешвання. Маючы пацеркі ўсяго двух-трох колераў, можна атрымаць шырокую гаму адценняў, вар'іруя суадносіны пацерак розных колераў. Плаўныя пераходы атрымліваюцца пры выкарыстанні пацерак гарманічных колераў (жоўтага, вохрыстага, чырвонага), а чаргаванне пацерак дадатковых колераў дазваляе аб'яднаць яркія плямы, каб не было бачна мяжы паміж імі. Трэба ўлічваць, што ў поўнай меры эфект прасторавага аптычнага змешвання ў бісерапляценні выяўляецца тады, калі бісерны выраб досыць буйнога памеру зроблены з вялікай колькасці маленькіх пацерак. Так, у сярэдзіне XVIII ст. былі распаўсюджаны шклярусныя і бісерныя пано, у якіх вышыўка бісерам і шклярусам цалкам пакрывала ўсю сцяну. І прыклад таму — шклярусны кабінет Кітайскага палацу ў Араніенбауме пад Пецярбургам. Вышыўка бісерам прасторы такога памеру вельмі падобна да жывапісу і па сутнасці з'яўляецца жывапісам. Манументальнасць такіх вышывак дасягаецца не толькі за кошт памеру, але і за кошт каляровага спектру, вытанчанасці маляўнічых спалучэнняў і паспяховасці перадачы сонечнага святу. Гульня свету на паверхні шкляных пацерак, камбінацыя каляровых плям і суадносіны шкляных пацерак — выразны дэкаратыўнавыяўленчы прыем, які стварае своеасаблівую ілюзію прасторы.

Такія вышыўкі суадносяцца з тэхнікай мазаікі. Калі пад словам «мазаіка» разумець разнавіднасць манументальнага жывапісу, заснаванага на выкарыстанні рознакаляровых цвердых рэчываў — смальты, рознакаляровых камянеў, каляровых эмалей, керамікі, дрэва і іншых каляровых элементаў [1], якія накладваюцца на паверхню з цэменту ці спецыяльнай масцікі. Так, адной з такіх мазаічных тэхнік можна назваць тэхніку выкладкі бісеру па воску,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якая дайшла да нас з XVIII ст. [5, с. 32]. Вельмі рэдкай была мазаічная тэхніка, якая існавала толькі ў 1755-1772 гадах на Каралавай фабрыке. Вядомы расійскі даследчык І. Меркулава дасканальна апісала гэтую тэхніку: «На драўляную (ці металічную або гліняную) паверхню наклейвалась ільняное палатно, потым нанасілась спецыяльная масціка шэравата-белага колеру. Паступова масціка зацвердзявала і ў гэтую, пакуль яшчэ мягкую, клейкую масу ўціскаліся ніці з нанізаным на іх бісерам» [4, с. 26-27].

Бісерные рэчы — гэта не толькі мазаіка, але і своесаблівы вітраж, калі пад словам «вітраж» разумець арнаментальныя кампазіцыі выкананыя з празрыстага шкла. Так, бісерныя рэчы, зробленыя з празрыстых пацерак, калі скрозь іх праходзіццЬ свет, напаўняюць прастору шматкаляровымі светавымі эфектамі, ствараючы атмасферу асобай светавой стыхіі, чысціні і цэласнасці — усяго таго, чым напаўнецца прастора гатычнага храма, калі сонечны свет пранікае праз вітражнае акно.

У спецыфіцы структуры любога бісернага твора — прынцып мастацкай манеры, распрацаванай неаімпрысіяністамі Ж. Сера і П. Сін'якам. Паводле поглядаў Ж. Сера і П. Сін'яка, мастак павінен кіравацца законам спектральнага аналізу, з дапамогай якога можна раскладаць колер і яго састаўныя часткі і абазначаць дакладныя межы ўзаемадзеяння тонаў (ад франц. division — падзел). Таму і назва гэтага напрамку — дывізіянізм. Калі імпрысіяністы дапускалі змешванне колераў на палітры, то дывізіяністы катэгарычна выключылі гэты прыем. Успрыманне колераў, якія мы бачым вакол сябе, выклікаецца ўздеяннем на вока складанага каляровага патока, які складаецца з светавых хваляў рознай даўжыні, але не ствараецца ўражання пярэстасці і рабізны, таму што у чалавечага вока ёсць якасць, якая дазваляе змешваць разнастайныя колеры. І патрэбны эфект можа быць дасягнуты толькі тады, калі маляўнічы мазок пэўнай формы — кропка. адсюль і назва новай школы кропкавага пісьма — пуантылізм (ад франц. point — кропка). Творы пуантыльнага пісьма нагадваюць мазаіку, а жывапіснае кропкавае пісьмо — тэхніку бісернага мастацтва. У 2006 г. у Расійскім Аўтарскім аб'яднанні была зарэгістравана аўтарская тэхніка пад назвай «Кузняцоўскае пісьмо» [3, с. 33]. Гэта вельмі незвычайная і складаная тэхніка, у якой працуе мастак Ю. Кузняцоў. Здаецца, што іконы, выкананыя ў гэтай тэхніцы, складаюцца з рознакаляровых камянеў і жэмчуга. Іконы мастка — гэта карункі бісерна-жамчужных кропак, у якіх кожная кропка нагадвае бісерыну. Ю. Кузняцоў пакуль што адзіны майстар, які працуе ў тэхніцы жамчужна-бісернага пісьма. Маляўнічая паверхня складаецца з бясконцай колькасці дробных кропак чыстых колераў. І толькі на пэўнай адлегласці кропкі зліваюцца разам, утвараючы пэўны малюнак. Паверхня любога бісернага вырабу таксама складаецца з мноства дробных пацерак-кропак. Дадзены прынцып паспяхова скарыстоўваецца майстрамі-бісершчыкамі. Такім чынам, бісернаму мастацтву ўласцівы рысы выяўленчага мастацтва, а выяўленчае мастацтва паспяхова выкарыстоўвае выразныя якасці бісернага мастацтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У наш час у сучасным мастацтве існуе паняцце піксельнай графікі. Мастакі, якія малююць у гэтым стылі, па рознаму вызначаюць само паняцце «піксельнай графікі». Піксел арт (pixel art) — гэта форма лічбавага мастацтва, створанага на кампутары з дапамогай растравага графічнага праграмнага забеспячэння, дзе малюнкі рэдагуюцца на ўзроўню піксела. Так як гэта досыць агульнае азначэнне I пад яго падпадае мноства твораў унікальнай графікі, то можна дадаць, што гэта такая графіка, у якой прысутнічае абмежаванне на колькасць колераў, памеры малюнку і яго выразнасць. У сучасных электронных графічных рэдактрах (Photoshop) існуе спецыяльная функцыя — фільтр «пуантылізм» (Pointilize), дзякуючы якой, малюнак можна разбіць на групы пікселаў, якія ⁿРадстаўляюць сабой кропкі. Калі параўноўваць карціны вышытыя бісерам з творамі піксельнай графікі, то відавочна, што мастакі, карыстаючыся толькі некалькімі асноўнымі колерамі ствараюць шэдэўры «піксельнага» шклянога мастацтва, да якіх неўзабаве можна дакрануцца. Іх выразная маляўнічая паверхня складаецца з тысяч пацерак-пікселаў.

З бісеру выконваюць не толькі пласкасныя кампазіцыі, але і мелкую (падобную да скульптуры) пластыку. Трохмерныя вырабы з бісеру — гэта не только жаночыя упрыгожванні (завушніцы, падвескі, калье, бранзалеты), але і шматлікія разнастайныя утылітарныя рэчы. Пералік рэчаў, выкананых з бісеру можна працягваць бясконца. Іконы, мазаікі, пано, разнастайныя жаночыя упрыгожванні, элементы дэкарыроўкі адзежы і абутку, кашалькі, жаночыя сумкі, чахлы для мабільных тэлефонаў, бірулькі, падстаканнікі, чубукі, вокладкі для запісных кніжак, заколкі для валос, рамкі для фотаздымкаў, шкатулкі, элементы дэкора для упрыгожвання камінаў і падставак для парасонаў.

Мы пераканаліськ на прыкладах, што бісер выкарыстоўваецца не толькі ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве, але і ў жывапісе. Увогуле, калі разглядаць дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, як «від мастацтва, які мае асобны мастацкі сэнс і сваю дэкаратыўную вобразнасць і разам з тым непасрэдна звязаны з бытавымі патрэбамі людзей» [1, с. 160], то ўсе вышэйпералічаныя рэчы, несумненна, адносяцца да гэтага віду мастацтва. Аднак, ссылка на ўтылітарнасць, як асноўнае адрозненне ДПМ ад так званых «чыстых» відаў мастацтва не заўседы апраўдана, калі гэта бісерная рэч. Прыгожая бісерная карціна мае выключна эстэтычнае апраўданне, таму што вышэйадзначаны параметр «палезнасці» не «працуе» ў гэтым выпадку.

Такім чынам, можна прыйсці да наступных высноў.

Бісернае мастацтва — самастойная з'ява ў мастацтве, якая павінна разглядацца ў не толькі ў асобным раздзеле ДПМ (галіна дэкаратыўнага мастацтва, звязаная са стварэннем па-мастацку аформленых прадметаў утылітарнага прызначэння), але ўваходзіць састаўной часткай у раздзел пад назвай «мастацкае шкло» ці «шкларобства». Акрамя гэтага, асобна трэба разглядаць тэхнікі стварэння бісерных рэчаў (вышыўка, пляценне, нізанне), якія

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўваходзяць у склад радзела рукадзелле; мазаічную і вітражную тэхнікі; унікальную жывапісную тэхніку жамчужна-бісернае пісьмо, якая не мае аналагаў у сусветным мастацтве, заснаваную на асаблівасцях чалавечага зроку.

Дзякуючы мастацка-выразным сродкам шкла, бісерныя творы з'яўляюцца своеасаблівымі жывапіснымі палотнамі. Пад жывапіснасцю ў гэтым сэнсе разумеецца асобы вынік мастацкага светаадчування, мастацкі вобраз, які вытанчаны як усеагульная гарманічная каляровая пабудова. Бісерныя пано, карціны, мазаікі і шпалеры адпавядаюць відавым прызнакам жывапісу. Так, гэта пласкасныя работы, якія акрэсліваюць адрэзак матэрыяльнай плоскасці з дапамогай выразных знакаў (ліній, святлоцені, колераў).

Большая частка бісерных рэчаў, іх функцыянальнае прызначэнне і выкарыстанне ў паўсядзенным жыцці чалавека дазваляюць канстатаваць, што бісернае мастацтва — гэта спецыфічны від ДПМ. Ацэньваючы гэтую спецыфіку трэба падкрэсліць унікальнасць і ўніверсальнасць бісеру, якія дазваляюць мастакам скарыстоўваць бісерныя тэхнікі ў такіх відах выяўленчага мастацтва як графіка, жывапіс і скульптура.

ЛІТАРАТУРА

1. Аполлон. Изобразительное и декоративное искусство. Архитектура: терминологический словарь / А. М. Кантор [и др.]; под общ. ред. А. М. Кантора. — М.: Эллис Лак, 1997. — 736 с.
2. Дударева, В. А. Бисер в старинном рукоделии / В. А. Дударева. — М.: Светлана, 1923. — 78 с.
3. Мамалыгина, С. Красота дивная / С. Мамалыгина II Наука и религия. — 2007. — № 4,С. 33
4. Меркулова, И. Бисерная мозаика Коралловой фабрики / И. Меркулова II Антиквариат, предметы искусства и коллекционирования. — 2004. — № 10. — С. 26-28.
5. Моисеенко, Е. Ю. Бисер и стеклярус в России: XVIII —начало XX века / Е. Ю. Моисеенко, В. А. Фалеева — Л.: Худож. РСФСР, 1990. — 255 с.
6. Яніцкая, М. М. Вытокі шкларобства Беларусі / М. М. Яніцкая. — Мінск: Навука і тэхніка, 1980. — 160 с.
7. Holm, E. Glasperlen. Mythos Smuck und Spilereien aus fiinf Jahrtausenden I E. Holm. — Miinchen, 1984.
8. Pazaurek, G. E. Glaser der Empire-und Biedermeierzeit IG. E. Pazaurek. — Leipzig, 1923.
9. Pazaurek, G. E. Kunstglasser der Gegenwart / G. E. Pazaurek. — Leipzig, 1925.
10. Pazaurek, G. E. Perlen und Perlenarbeiten in alter und neuer Zeit / G. E. Pazaurek. — Darmstadt, 1911.

Saharchuk Alesia
THE DECORATIVE FEATURES OF BEADWORK

In this article the author offers an innovative approach to the art of beadwork as an independent kind of the decorative and applied arts. The author considers the art of glass beadwork from the standpoint of other kinds of the fine arts, concentrates on theoreticmethodological aspect and gives his own interpretation to the word «beads» and its classification. The author analyses the use of beads and their decorative features.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ